Нами было установлено, что в многодетных семьях у родителей преобладают следующие жизненные ценности: здоровье – (28%); семья – (56%); служение – (12%); отдых – (4%). Соответственно, прерогативной ценностью среди членов многодетных семей является семья и здоровье.

**Заключение.** Таким образом, результаты тестирования и анкетирования показали, что для многодетных родителей наиболее высоким уровнем значимости обладают такие жизненные ценности как благополучие семьи у 60% опрошенных и социальное положение – у 12% опрошенных. В многодетных семьях для родителей наиболее значимыми являются посвященность семье и супруг (супруга) как спутник по отдыху. Преобладающими жизненными ценностями для многодетных родителей являются семья и здоровье.


Список использованных источников:

1. Алексеенко, Я.И. Структура ценностных ориентаций современной молодежи / Я.И. Алексеенко // Веснік ВДУ. – 2016. – № 6. – С. 108 – 113.
2. Артамонова, Е.И. Психология семейных отношений с основами семейного консультирования / Е.И. Артомонова / Под ред. Е.Г. Силяевой. – М.: Академия, 2010. – 322 с.
3. Ахмерова-Ильина, Л.В. Ценностные ориентации личности учащихся и их роль в организации образования в общеобразовательной школе: автореф. дис. … канд. социолог. наук / Л.В. Ахмерова-Ильина: 22.00.06. – М., 2016. – 18 с.
4. Батура, И.Н. Воспитание будущего семьянина / И.Н. Батура // Праблемы выхавання. – 2016. – № 2. – С. 39-41.
5. Безопасное и ответственное поведение: цикл бесед, практических и тренинговых занятий с учащимися I-XI классов о ВИЧ-инфекции и наркотической зависимости, о семье и семейной жизни: пособие для воспитателей, психологов и социальных педагогов. В 3 ч. / А.Н. Сизанов [и др.]; под ред. А.Н. Сизанова. – М.: Тесей, 2010. – Ч. III. Примерное содержание работы по программе. – 176 с.
6. Белова, И.А. Основные направления совершенствования правового регулирования государственной адресной социальной помощи в Республике Беларусь / И.А. Белова // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2017. – № 3. – С. 120- 126.



**У.А. РЫМША**

Рэспубліка Беларусь, Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава


## ТЫПАЛАГІЧНЫЯ ПАРАЛЕЛІ ВОБРАЗНАЙ СІСТЭМЫ АПОВЕСЦІ «ЦЫГАНСКІ КАРОЛЬ» У. КАРАТКЕВІЧА З СУСВЕТНЫМ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСТАМ

**Уводзіны.** Думаецца, усімі аматарамі беларускага мастацкага слова прызнаецца той факт, што Уладзімір Караткевіч – носьбіт шматграннага таленту, непераўзыдзены па самабытнасці і творчай дасканаласці пісьменнік. Любы гістарычны час і сістэма вобразаў у яго мастацкай прасторы раскрываліся шматтузроўнева, фактычна «ажывалі». І дзеля паглыблення ў іншую эпоху аўтар не проста з энцыклапедычнай скрупулёзнасцю апісваў адпаведныя факты, а праз каларытны архаічны базіс пераканальна раскрываў яркіх персанажаў далёкай ад чытача эпохі. Пры гэтым пісьменніка цікавіла многае: стаўленне продкаў да навакольнага свету, імператываў жыцця і смерці, сацыяльная іерархія, побытавыя дэталі, культурныя вектары, у тым ліку і народныя смехавыя традыцыі (так званыя праявы народнай карнавальнасці). І гэта разам прыводзіла да дасканалага мастацкага паказу. Як слушна адзначаў вядомы бедарускі літаратурны крытык, літаратуразнавец Анатоль Верабей: «Уладзіміру Караткевічу ўласціва рамантычнае, фальклорна-міфалагічнае і адначасова канкрэтна гістарычнае, па-мастацку дакладнае і дасканалае асэнсаванне мінуўшчыны» [1, с. 76].

Мастацкая сістэма Караткевіча ўключае і камічны складнік. Так, у аповесці «Цыганскі кароль» аўтар не проста перадае гістарычны факт існавання цыганскага «каралеўства», а насычае твор арганічнымі часу гумарыстычнымі і сатырычнымі апісаннямі. Пісьменнік выкарыстоўваў прыёмы гратэскавага рэалізму, даючы з’едлівыя характарыстыкі каралю і яго падданым. Пры гэтым важна ўлічваць і некаторае падабенства герояў аповесці з рэальнымі гістарычнымі асобамі. Адзначаныя стылявыя адметнасці твора заўважаліся некаторымі

даследчыкамі (А. Вераб'ём, Е. Лявонавай, В. Шынкарэнка і інш.), але цэласнае асэнсаванне такой дыскурснай з'явы яшчэ бачыцца толькі перспектыўным праектам.

**Мэта** артыкула – вызначыць істотнасць ідэйна-мастацкага ўплыву вобразаў сусветнай гісторыі і літаратуры на сістэму персанажаў аповесці «Цыганскі кароль» У. Караткевіча. Дадзенае даследаванне праводзілася з выкарыстаннем прыёмаў канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага метадаў.

Адным з галоўных герояў твора з'яўляецца Якуб Знамяроўскі, так званы цыганскі «кароль». Ён вельмі ўдала апісваецца ў эпізодзе першага спаткання з ім галоўнага героя: «За гэтым відовішчам Міхал не заўважыў, што ў дзвярах ужо стаяў сам кароль, заспаны, азызлы, і моцна соп носам. На ім была кашуля да пупа, і на галаве срэбны абруч. Якуб нагадваў Апалона, калі богу было пад сорак год і ён густа зарос драмучымі валасамі» [2, с. 165].

Старажытнагрэчаскі бог Апалон вядомы ўсім як бог святла, натхнення, правадыр муз. У шырокім значэнні Апалонам называюць добраскладзенага прыгожага мужчыну. Уладзімір Караткевіч у сваім творы выкарыстоўваў такое камічнае партрэтаванне Знамяроўскага, каб яскрава паказаць яго вобраз чытачу і камічна падкрэсліць недарэчнасць, парадыйнасць гэтага «караля».

Далей аўтар прыпадабняе Якуба да не менш велічнага вобраза Нерона: «Дзікімі вачыма глядзеў на гэтае спусташэнне Яноўскі. Гэта была галеча. Уварваліся, як дзікія гуны, і знішчылі ўвесь дабрабыт. А на ганку, асветлены зарывам, стаяў кароль Якуб і, абапіраючыся на шаблю, глядзеў на агонь, як Нерон на пажар вечнага горада» [2, с. 200].

Нагадаем, што Нерон – рымскі імператар, вядомы сваёй жорсткасцю і прагай да ўлады. Лічылася, што Нерон падпаліў Рым, каб любавацца відовішчам палаючага вялікага горада.

Але тут беларускі пісьменнік камічна гіпербалізуе вобраз Якуба Знамяроўскага, параўноўваючы яго з жорсткім імператарам. Таму, на фоне Нерона, цыганскі «кароль» прадстае чытачу не такім уж небяспечным, страшэнным чалавекам, а выклікае нават спачуванне. Таксама прыведзенае апісанне галоўнага героя набывае камічную кантрастнасць, бо праз яго выяўляецца памылковае ўнутранае стаўленне Знамяроўскага да сябе, як да бясстрашнага магутнага уладара, якога ўсе баяцца.

Вартым увагі з'ўляецца і параўнанне вобраза манаха з яшчэ адным вядомым персанажам: «Гайдукі падхапілі манаха і пацягнулі, але ён яшчэ некаторы час упіраўся, напінаўся і пры гэтым роў, пляваўся і вытвараў усякія іншыя дзеянні, як Гарганцюа» [2, с. 165]. Гарганцюа – герой сатырычнага рамана Франсуа Рабле «Гарганцюа і Пантагруэль». Гэты вобраз – адзін з сімвалаў Рэнесансу, увасабленне адмовы ад традыцыйных жыццёвых правіл Сярэднявечча, цікавасці да свецкага напрамку ў мастацтве, спробаў рацыянальнага, матэрыялістычнага спазнання свету, вольнасці ў паводзінах і г.д. Таму ў аповесці «Цыганскі кароль» аўтар, жадаючы паказаць пародыю на існага манаха, дэманструе неахайнага, дурнога, ласага да «зямных» асалодаў персанажа, тыпалагічна блізкага да аднаго з вечных вобразаў Рабле.

**Заключэнне.** Такім чынам, у прааналізаванай камічнай аповесці Уладзіміра Караткевіча часта практыкуецца аўтарам мастацкі прыём характарыстыкі пэўнага персанажа праз трапнае параўнанне яго з агульнавядомым героем з сусветнай літаратуры. Гэта дазваляла пісьменніку не толькі лаканічна і адначасна запамінальна абмалёўваць вобразы, але і спрыяла арганічнаму пашырэнню сусветнай камічнай традыцыі.

Спіс цытаваных крыніц:

1. Верабей, А. Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць / А. Верабей. – М.: Бел.навука, 2005. – 271 с.
2. Караткевіч, У. Сівая легенда. Ладдзя Роспачы. Цыганскі кароль / У. Караткевіч. – М.: Папуры, 2018. – 240 с.